## ФІГУРЫ ПАЎТОРУ Ў ПАЭМЕ Я. КОЛАСА “СЫМОН-МУЗЫКА”

***К. В. Лямешчанка*** *(УА «ГДУ імя Ф. Скарыны»)*
*Навук. кір.* ***А. А. Станкевіч,***
*доктар філал. навук, прафесар*

Важным спосабам арганізацыі вершаванай мовы выступае такі сродак паэтычнага сінтаксісу, як фігуры паўтору – канструктыўныя слоўныя фігуры, заснаваныя на паўтаральнасці моўных адзінак. Да іх адносяць анафару, ампліфікацыю, гемінацыю, дыяфару, кальцо, падваенне, паліптатон, полісіндэтон, эпаналепсіс, эпіфару і інш.

Паводле пазіцыі паўтораў у сказе вылучаюць лакалізаваныя і нелакалізаваныя паўторы. Лакалізаваныя паўторы – гэта паўторы, за якімі ў складзе суседніх сказаў замацоўваецца пэўнае месца: *Кінуў хлопец яго, кінуў!* [1, с.110] Да іх належаць анафара, эпіфара, сімплака, кальцо, анадыплозіс.

Нелакалізаваныя паўторы не замацаваны за пэўным месцам у вершаваным радку або страфе: *Неба ззяе, неба дыша, /як бы нейкі напіс піша,*[1, с.91]. Найбольш пашыранымі відамі такіх паўтораў у паэме Я. Коласа “Сымон-музыка” з’яўляюцца падваенне, дыяфара, полісіндэтон, паліптатон, ампліфікацыя, шматпрыназоўнікавасць.

У паэтычных творах выкарыстоўваюцца паўторы рознага тыпу сінтаксічных канструкцый: паўтор слова, словазлучэння, сказа. Паўтор аднаго слова звяртае ўвагу на пэўны аб’ект ці суб’ект выказвання, яго дзеянне або якасць. Паўтор словазлучэння ўносіць дадатковую інфармацыю ў выказванне. Пры паўторы сказа падкрэсліваецца пэўная думка аўтара. Паўтарацца могуць розныя часціны мовы. Гэта залежыць ад таго, якую сінтаксічную ролю яны выконваюць.

Такім чынам, фігуры паўтору надаюць паэтычнаму тэксту новае гучанне, садзейнічаюць яго звязанасці і цэласнасці. Разнастайныя віды паўтораў з’яўляюцца важным стылістычным прыёмам для стварэння выразнасці паэтычнай мовы.

**Літаратура**

1 Колас, Я. Сымон-музыка : паэма / Я. Колас. – Мінск : Юнацтва, 1989. – 270 с.

## АПАЗІЦЫЯ “ГОРАД – ВЁСКА” Ў СУЧАСНАЙ ПАЭЗІІ Ў КАНТЭКСЦЕ ПРАБЛЕМЫ БУДУЧЫНІ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ

***Д. В. Мальцава*** *(УА «ГДУ імя Ф. Скарыны»)*
*Навук. кір.* ***А. В. Брадзіхіна,***
*канд. філал. навук, дацэнт*

Праблема будучыні беларускай культуры, а разам з тым і нацыі, надзвычай востра стаіць у літаратуры і сёння. Сучасныя пісьменнікі пакутліва шукаюць адказ на пытанне, якая ж прастора будзе трывалай апорай беларусам – гарадская ці вясковая? Адказы разыходзяцца нават у межах аднаго сямейнага паэтычнага дуэта – В. Шніпа і Л. Рублеўскай.

Горад, на думку В. Шніпа, не прымае жыхароў вёскі. І справа, канешне, не ў бытавых праблемах, а хутчэй у духоўным непрыняцці вяскоўцамі тых маральных прынцыпаў, якія прапагандуе чужая, нават варожая ім урбаністычная прастора. Таму горад паўстае ў паэзіі В. Шніпа ў рэалістычна-непрывабных фарбах. Тут пануе ўсёдазволенасць “моцных гэтага свету”, пачуцці з’яўляюцца таннымі падробкамі, а ўменне ашукваць і халтурыць ёсць неабходная ўмова выжывання (“Балада горада”, “Яшчэ горад не спіць…”). Таму ў паэзіі В. Шніпа горад увасоблены ў вобразе турмы, з якой немагчыма збегчы, ці магілы, у якой наканавана скончыць сваё жыццё. І толькі родны дом у вёсцы звязваецца з выратаваннем душы і параўноўваецца з Ноевым каўчэгам: “Дзе дарога дамоў, як на Ноеў каўчэг” [1, с. 34]. Тым